# Новае пра Змітрака Бядулю

***У рамках бібліямарафона «Літаратурны хіт-парад», прымеркаванага да Дня бібліятэк, 15 верасня ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна адбылася сустрэча* «Невядомыя факты творчай біяграфіі Змітрака Бядулі» *з Яфімам Самуілавічам Плаўнікам – сынам Змітрака Бядулі.***

Змітрок Бядуля (сапраўднае імя Самуіл Плаўнік) – беларускі пісьменнік, лексікограф, вядомы не толькі сваімі літаратурнымі творамі, але і актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Ён супрацоўнічаў з газетамі «Наша Ніва», «Вольная Беларусь», «Беларускі шлях», «Савецкая Беларусь», быў рэдактарам дзіцячага часопіса «Зоркі» і краязнаўчага-этнаграфічнага часопіса «Наш край». Быў знаёмы і разам працаваў з Янкам Купалам і Якубам Коласам, з'яўляўся сябрам літаратурных аб'яднанняў «Маладняк» і «Узвышша». Пісьменнік стварыў такія знакавыя творы, як паэма «Ярыла», аповесць «Салавей», раман «Язэп Крушынскі».



*Яфім Плаўнік*

На сустрэчы з чытачамі Яфім Самуілавіч падзяліўся сваімі дзіцячымі ўспамінамі пра бацьку і яго блізкае атачэнне, а таксама пра спадчыну знакамітага пісьменніка. Прысутныя даведаліся аб фактах з біяграфіі і творчасці Змітрака Бядулі, якія да сённяшняга дня не асвятляліся ў крыніцах масавай інфармацыі.

***Паводле паведамлення бібліятэкі***

